**ПО́ЛАЦКІ КНЯ́ЖАЦКІ ЦЕ́РАМ**, археалагічны помнік, які размяшчаўся на паўн.-зах. ускраіне *Полацкага Верхняга замка*. У 1976—77 даследаваў П.А.Рапапорт. П.к.ц. уяўляў невял., амаль квадратны ў плане цагляны будынак памерамі 4,7×4,2 м. На З да яго прымыкала меншае па плошчы цаглянае памяшканне памерамі 2,5×2,4 м і зрубавая прыбудова памерамі 5,3×5,4 м. Падмурак складзены з камянёў на вапнавай рошчыне. Аснова падлогі выкладзена камянямі на вапнавай рошчыне, зверху на тонкім пласце гліны быў насціл з дошак. Пытанне аб датаванні церама з'яўляецца дыскусійным. Паводле П.А.Рапапорта, ён быў узведзены ў 3-й чв. 12 ст. разам з царквой Архангела Міхаіла. Аднак гэтаму супярэчыць наяўны археал. матэрыял. Так, спосаб уладкавання падмурка церама сведчыць пра яго будаўніцтва ў 14 ст. Рэшткі самай ранняй з 5 печаў, раскапаных у драўлянай прыбудове, паводле даных дэндра-храналогіі датуюцца 1304. Такім чынам, церам з цэглы і драўляную прыбудову каля яго магчыма датаваць не раней за 14 ст. Можна пагадзіцца з думкай аб прыналежнасці П.к.ц. ў 14—16 ст. да комплексу княжацкага двара. Магчыма, што ў гэты час на Верхнім замку існавала гар. сядзіба князя накшталт Дворышча Яраслава ў Ноўгарадзе. Аднак не выключана прыналежнасць церама да епіскапскага двара.

*Літ.*: Раппопорт П.А. Полоцкое зодчество XII в. // СА. 1980. № 3; Заяц Ю.А. О постройке с



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

изразцовыми печами возле княжеского терема в Полоцке // ГАЗ. 1997. № 12; Дук Дз. Ад Рагвалода да Івана Гознага: Верхні Замак у сацыяльнай тапаграфіі Полацка // БГЧ. 2010. № 5. *Дз.У.Дук.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова